# Памяти ученого

# To the memory of scientist

**Станислав ГАЙДА**

**Станіслаў ГАЙДА**

**Stanisław GAJDA**



Сумная вестка прыйшла з Апольскага ўніверсітэта (Польшча), дзе 23 лістапада 2022 г. на 78-м годзе спыніўся жыццёвы шлях аднаго з найбольш выбітных еўрапейскіх славістаў апошняй чвэрці XX – пачатку XXI ст. доктара філалагічных навук, прафесара Станіслава Гайды.

У асяроддзі беларускіх мовазнаўцаў імя польскага філолага, спецыяліста ў галіне польскай і славянскай лінгвістыкі, лексікалогіі, сацыялінгвістыкі, стылістыкі і тэорыі тэксту стала вядомым у 1990 г., калі 24–26 верасня ў тады яшчэ Вышэйшай педагагічнай школе імя паўстанцаў Шлёнскіх праходзіла навуковая канферэнцыя «Сінтэз у славянскай стылістыцы» («Synteza w stylistyce słowiańskiej») і была прапанавана ідэя падрыхтоўкі Міжнароднага праекта «Змены ў сучасных славянскіх мовах» («Najnowsze dzieje języków słowiańskich»). Выказаную С. Гайдам прапанову аднадушна падтрымалі Т. Р. Вінакур, С. Дзімітрова, М. П. Кацюрава, Т. І. Панько, Р. Я. Салганік, М. Ялінек, М. Р. Прыгодзіч і інш. На наступных штогадовых сустрэчах каардынатараў і выканаўцаў праекта была выпрацавана агульная канцэпцыя і ўзгоднена структура асобных манаграфій па кожнай са славянскіх моў. Шчырая заклапочанасць кіраўніка праекта вынікамі працы кожнага навуковага калектыву стала трывалай асновай будучага поспеху ўнікальнай для сусветнай славістыкі 14-томнай манаграфіі (Мінск, 1996–2004). Падрыхтоўцы беларускай часткі даследавання паспрыялі вынікі Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя», якая праходзіла на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта 22–24 кастрычніка 1997 г. На канферэнцыі з грунтоўным дакладам выступіў і С. Гайда. Калектыўная манаграфія «Беларуская мова» (Аполе, 1998), падрыхтаваная ў рамках адзначанага праекта Л. Ц. Выгоннай, В. П. Краснеем, А. А. Крывіцкім, А. А. Лукашанцам, М. Р. Прыгодзічам, Т. Р. Рамзай, Л. І. Сямешкай і І. Р. Шкрабай, стала першай замежнай працай айчынных лінгвістаў.

Падчас выканання гэтага праекта Станіслаў Гайда стаў заснавальнікам і шматгадовым галоўным рэдактарам часопіса «Стылістыка». Менавіта дзякуючы плённай міжнароднай дзейнасці дырэктара Інстытута польскай філалогіі (1990–2012) і загадчыка кафедры польскай мовы (1998–2012) былая вышэйшая школа атрымала статус паўнапраўнага

CC BY NC

дзяржаўнага ўніверсітэта ў сталіцы Апольскага ваяводства.

Сярод найбольш значных работ польскага славіста можна адзначыць 4-томнае выданне «Параўнанне сістэм і функцыянавання сучасных славянскіх моў» («Komparacja systemów i funkcjonowania współczesnych języków słowiańskich», 2003–2009), выданні «Новыя дыскурсіўныя таварыствы супраць камунікатыўнай адукацыі» («Nowe społeczności dyskursywne a edukacja kommunikacyjna», 2001), «Новыя сродкі масавай інфармацыі ў лінгвістычнай перспектыве» («Nowe media w perspektywie lingwistycznej», 2010) і інш. Усяго на творчым рахунку С. Гайды налічваецца амаль 300 навуковых публікацый.

Высока адзначаны ў краіне і за яе межамі навуковы і выключны арганізатарскі талент С. Гайды. У 2010 г. ён стаў членам-карэспандэнтам, а ў 2016 г. – сапраўдным членам Польскай акадэміі навук. З 2000 г. С. Гайда з'яўляўся членам прэзідыума Міжнароднага камітэта славістаў, а ў 2018 г. на чарговым форуме славістаў у Бялградзе ён быў абраны ганаровым членам гэтага камітэта. Акрамя таго, С. Гайда быў ганаровым членам Чэшскага лінгвістычнага таварыства, атрымаў званне ганаровага доктара (*honoris causa)* Універсітэта Святых Кірылы і Мяфодзія (Скоп'е), Педагагічнага ўніверсітэта (Кракаў) і Універсітэта гуманітарных навук і навук аб жыцці імя Яна Длугаша (Чэнстахова).

Стасункі С. Гайды з беларускімі лінгвістамі А. Я. Супруном, Б. А. Плотнікавым, Г. А. Цыхуном, Н. Б. Мячкоўскай, А. А. Лукашанцам і правядзенне штогадовых міжнародных славістычных канферэнцый у Апольскім універсітэце паспрыялі актыўнаму ўдзелу ў іх такіх навукоўцаў, як А. І. Яновіч, Л. М. Шакун, Л. І. Сямешка, В. П. Красней, Л. М. Чумак, І. Р. Шкраба, А. А. Ціхамірава, а таксама многіх аспірантаў БДУ, якія пазней сталі кандыдатамі і дактарамі філалагічных навук.

У памяці тых, хто ведаў С. Гайду і працаваў разам з ім, ён застанецца ўдумлівым вучоным, тактоўным педагогам і выкладчыкам, таленавітым арганізатарам і добразычлівым дарадчыкам.

***М. Р. Прыгодзіч***[1]

[1]*Николай Григорьевич Пригодич* – доктор филологических наук, профессор; заведующий кафедрой белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета.

*Мікалай Рыгоравіч Прыгодзіч* – доктар філалагічных навук, прафесар; загадчык кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Mikalaj R. Pryhodzich*, doctor of science (philology), full professor; head of the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University.

E-mail: *prigodichng@bsu.by*